# Наш галоўны часопіс пра фальклор

***Зборнік «Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні» адзначыў свой першы юбілей. З гэтай нагоды 4 мая ў Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася прэзентацыя 10-і яго нумароў.***

Зборнік выходзіць з 2014 года ў выдавецтве «Беларуская навука» і з'яўляецца фундаментальным. Яго заснавальнік – Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Выданне прысвечана не толькі фальклорным тэкстам, яго тэматыка больш шырокая – традыцыйная культура беларусаў, якая вывучаецца комплексна: абрадавыя практыкі (у тым ліку ў сучасных формах), міфалогія, сакральная геаграфія, народная музыка, уласна паэтычны і празаічны фальклор. Традыцыйныя рубрыкі: «Даследаванні», «Матэрыялы і вынікі палявых даследаванняў», «Беларускі фальклорна-этналінгвістычны атлас», «Фальклор беларусаў замежжа», «З рукапіснай фальклорнай спадчыны», «Беларускі фальклор у гістарычных дакументах» і інш. Тут публікуюцца інтэрв'ю з даследчыкамі, агляды, рэцэнзіі, хронікі канферэнцый, унікальныя архіўныя запісы, матэрыялы экспедыцый у розныя раёны Беларусі і замежжа. Не хапае хіба што палемікі, навуковых рэцэнзій – але гэта ўсё ў планах выдаўцоў.

Аўтары зборніка – гэта не толькі філолагі, фалькларысты, але і этнографы, мастацтвазнаўцы, спецыялісты-практыкі. З аднаго боку, працы падаюцца ў акадэмічным фармаце, з іншага – яны даступныя для разумення ўсім, хто цікавіцца народнай спадчынай.

Усе артыкулы прысвечаны менавіта беларускаму фальклору, часам у параўнанні з народнай творчасцю суседніх краін. Сярод аўтараў і навукоўцы замежжа, іх тэксты публікуюцца ў перакладзе. Часопіс цалкам беларускамоўны (анатацыі і змест дублюоцца на рускай і англійскай мовах). Зборнік сёлета ўключаны ў міжнародную навукаметрычную рэфератыўную базу дадзеных Scopus, адну з самых прэстыжных у свеце, што сведчыць пра высокі ўзровень навуковых публікацый. Таксама выданне ўваходзіць у Пералік выданняў ВАК Беларусі для публікацыі вынікаў дысертацыйных даследаванняў і базу дадзеных Расійскага індэкса навуковага цытавання (РІНЦ).

Галоўны рэдактар часопіса, вядомая беларуская даследчыца, загадчыца аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, дацэнт Таццяна Валодзіна распавяла пра гісторыю яго стварэння, падзякавала ўсім, хто стаяў каля вытокаў выдання і хто працуе над ім сёння.

Гэты часопіс стаў першым спецыялізаваным перыядычным выданнем навуковых прац пра нацыянальны фальклор. Аналагічныя зборнікі ўжо былі ў большасці краін Заходняй і Усходняй Еўропы. І вось беларускія фалькларысты сталі думаць, дзе прадставіць грамадству свае дасягненні. Так з'явілася ідэя зрабіць сваё профільнае выданне.

Таццяна Валодзіна распавяла, што ў першую рэдакцыйную раду ўвайшлі вядомыя беларускія навукоўцы: Уладзімір Лобач, Сяргей Санько, Юрый Унуковіч, Алена Боганева, Яніна Грыневіч, Анастасія Гулак, Мікалай Антропаў і інш. Арсень Ліс і іншыя карыфеі беларускай навукі выступілі ў якасці кансультантаў. Далучыліся да справы Тадэвуш Навагродскі, Іна Швед, Сяргей Віцязь, Лізавета Квілінкова. Падтрымалі выданне замежныя калегі: Альберт Байбурын, Фларэнціна Бадаланава-Гелер, Андрэй Мароз, Станіслава Небжэгоўска-Бартмінська, Любінка Радэнкавіч, Марэ Кыйва. Так сфармавалася кола аднадумцаў.


Выступае Таццяна Валодзіна

Галоўная рэдактарка прасачыла эвалюцыю выдання, «прайшлася» па асобных рубрыках і знакавых матэрыялах.

*«Першыя нумары былі збольшага вузка філалагічна-фалькларыстычнымі, недзе нават хрэстаматыйна-паказальнымі. Мы стараліся ўзяць найбольш яркія, вузлавыя моманты ўласна вуснапаэтычнай творчасці. Некалькі нашых зборнікаў прысвечаны ўсебаковаму разгляду той ці іншай з'явы традыцыйнай культуры. Напрыклад, у другім нумары разглядаўся абрад Ваджэння Куста: адна з'ява і розныя, нават супярэчлівыя погляды шэрага аўтараў. Мой любімы, трэці выпуск, напэўна, самы аб'ёмны з усіх, прысвечаны замовам. У ім узялі ўдзел навукоўцы з некалькіх краін, прадставіўшы свой погляд на нашу традыцыю. Фактычна ў фармаце "манаграфія ў зборнік" выйшаў 6-ы выпуск, дзе разглядалася творчасць нашага славутага пісьменніка Яна Баршчэўскага».*

Паступова выкрышталізоўвалася ўяўленне: зразумець фальклорны тэкст без шырокага кантэксту амаль немагчыма. *«Ужо з 4-га нумара на старонках зборніка з'явіліся этналагічныя аспекты даследаванняў. Асобны нумар быў прысвечаны музыказнаўчым падыходам да беларускага фальклору. І чым далей, тым бліжэй мы падыходзілі да зацвярджэння ў межах нашага часопіса таго, што фалькларыстыка і этнаграфія – гэта часткі аднаго вялікага цэлага. І чым далей, тым больш пачынаюць друкавацца матэрыялы даволі шырокай светапоглядной плыні».*

Вельмі важным блокам у зборніку выступіў «Беларускі фальклорна-этналінгвістычны атлас» (мапы падрыхтаваў Цімафей Авілін), які адлюстроўвае геаграфічнае пашырэнне пэўных абрадаў, традыцый і іншых з'яў. У рубрыцы «Беларускі фальклор у рукапісах і архівах» публікаваўся адзін з самых ранніх тэкстаў беларускага фальклору – рукапісы Яна Чачота, падрыхтаваныя да друку Вячаславам Мартысюком. У рубрыцы «Беларускі фальклор у замежных публікацыях» у 1-м нумары з'явіўся артыкул балгарскай даследчыцы Фларэнціны Бадаланавай пра народную Біблію беларусаў, які выйшаў ажно ў Новай Зеландыі.

Асаблівы гонар рэдактаркі – публікацыя «Запісы з Бернардзінскага архіва 1764 г. як этнаграфічная крыніца» (аўтары – Дзмітрый Скварчэўскі, Віталь Быль). Яна паказвае, што першыя пісьмовыя гістарычныя крыніцы па беларускім фальклоры з'явіліся задоўга да XIX стагоддзя. Таксама Т. Валодзіна згадала іншыя канцэптуальна важныя рубрыкі: «Фальклор беларусаў замежжа» (тут прадстаўлены практычна ўсе памежныя рэгіёны, у т.л. Пскоўшчына, Смаленшчына, Браншчына, Беласточчына), «З калекцыі фальклорных запісаў» і інш.

Пад час імпрэзы Кацярына Радзівілава выканала некалькі беларускіх народных песень і музычных кампазіцый на традыцыйных інструментах: дуда, жалейка, колавая ліра. А сваю павагу і падзяку выданню выказалі Сяргей Грунтоў, Вольга Лабачэўская, Таццяна Лапцёнак, Вераніка Курцова, Алена Боганева.




*«"Беларускі фальклор..." – важная пляцоўка, дзе сёння маюць магчымасць публікаваць свае напрацоўкі беларускія навукоўцы»,* – зазначыла доктар мастацтвазнаўства, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Вольга Лабачэўская. У адным з нумароў з'явіўся яе артыкул «Патрыятычная міфалогія беларускага арнаменту прафесара М. С. Кацара». Яго можна лічыць «праграмным» для беларускай гуманітарнай навукі, гэтая праца была адзначана прэміяй Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі.

Як зазначыў сталы аўтар выдання, кандыдат гістарычных навук Сяргей Грунтоў, «Беларускі фальклор...» – *«адзін з самых важных гуманітарных часопісаў за апошнія 10 гадоў, якія застануцца памяццю пра нашае пакаленне, як "Наш край" ў 1920-я гады ці "Спадчына" ў 1990-я».* Дарэчы, артыкул навукоўца, апублікаваны ў зборніку летась («Партрэты блізкіх. Фотаздымкі ў беларускіх вясковых інтэр'ерах»), хутка «перарос» у манаграфію, якая сёлета была выдадзена асобнай кнігай («Фатаграфія і культура памяці ў беларусаў у другой палове XIX – пачатку XXI ст.»).

Апошні, 10-ы выпуск зборніка можна набыць у кнігарні «Акадэмічная кніга» і гандлёвай сетцы «Белкніга». У ім шмат цікавага. Напрыклад, артыкулы Іны Швед «Хата і яе інтэр'ер у беларускіх і ўкраінскіх загадках», Мары Андрунінай «Рэфлексы матыву "Грамаўнік гоніць нячыстую сілу" ва ўсходнеславянскай абраднасці Стрэчання», Таццяны Агапкінай і Таццяны Валодзінай «Перагогі: найменне і замовы ў беларускай і ўкраінскай традыцыйнай культуры», Іллі Бутва «"Мокрыя" і "плачлівыя" камяні на тэрыторыі Беларусі і Латвіі» і інш.

Выданне мае сваю старонку ў сеціве, дзе выкладзена большая частка публікацый: https://ethno.by/bielaruskifalklor. Існуе гэты рэсурс дзякуючы праграмісту, стваральніку базы «Этнаўсё» Яўгену Барышнікаву.

**Воля ЧАРНОВА**
**Фота аўтара**